Як адбываецца барацьба за тэрыторыю, карэспандэнт «Звязды» ўбачыў падчас арніталагічнай экскурсіі на адной з сажалак, дзе мацнейшая пара лебедзяў-шыпуноў праганяла іншую. СТАР 3

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

30 КАНАЛАЎ

Легенды — неад'емная частка жыцця любога старога горада. Мінск таксама надзвычай багаты на таямнічыя гісторыі пра некаторыя містычныя мясціны. СТАР. 12

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

29 САКАВІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 58 (27423) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«УВЕСЬ СВЕТ АБ'ЯДНОЎВАЕЦЦА»

Развіццё ваеннага складніка АДКБ абмеркавана на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Мікалая Бардзюжы

Развіццё ваеннага складніка АДКБ і сітуацыя ў яе зоне адказнасці абмеркаваны 28 сакавіка на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалаем Бардзюжам.

«Мы на правільным шляху. Я прыехаў з далёкага і няпростага рэгіёна Паўднёва-Усходняй Азіі. Праводзячы перагаворы, сустракаючыся са службовымі асобамі, я адзначаў, што ўсе ўсюды з гонарам гавораць аб тым, што аб'ядноўваюцца ў саюзы, пакуль гандлёвыя, гандлёва-эканамічныя. Але калі ёсць агульныя інтарэсы, то не далёкі той час, калі ім давядзецца (палітыка, зразумела, ідзе за эканомікай) прэвентыўна абараняць уласныя інтарэсы і ваенным чынам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Таму ўвесь свет аб'ядноўваецца ў такія арганізацыі, не толькі ў рэгіёне Паўднёва-Усходняй Азіі, — прадоўжыў Прэзідэнт. — Знаходзячыся ўжо ў рэгіёне Персідскага заліва, сустракаючыся са службовымі асобамі, я ад іх тое ж самае чуў, што краіны Заліва дамаўляюцца, у іх агульная мытная прастора, адзіная эканамічная палітыка, якая сёння напрацоўваецца. Ну а як краіны Заліва ўмеюць калектыўна абараняцца, мы ўжо бачылі гэта на прыкладзе Бахрэйна. Калі сітуацыя ўскладнілася, Саудаўская Аравія дапамагла і іншыя краіны».

«Я гэта кажу для таго, што нам няма чаго саромецца гаварыць аб тым, што ў нас ёсць ваенная арганізацыя і мы будзем усяляк яе ўмацоўваць. Лічу, пад гэтым лозунгам павінна прайсці і наша нефармальная сустрэча ў Кыргызстане, якую мы плануем», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Мікалай Бардзюжа далажыў Аляксандру Лукашэнку аб ходзе рэалізацыі рашэнняў Савета калектыўнай бяспекі, прынятых у снежні 2012 года, а таксама аб падрыхтоўцы пасяджэнняў статутных органаў Арганізацыі.

«Мы пачалі рэалізацыю тых, на мой погляд, прарыўных рашэнняў, якія прэзідэнты прынялі ў снежні на чарговай сесіі СКБ, у тым ліку тых, якія датычацца фактычна рэфармавання ваеннага супрацоўніцтва, выхаду на якасна новы ўзровень», — адзначыў генеральны сакратар.

Мікалай Бардзюжа згадаў аб прынятым рашэнні па стварэнні войскаў — Калектыўных сіл АДКБ, у якія ўвойдуць розныя ваенныя структуры Арганізацыі. «Мы завяршылі падрыхтоўку задумы стварэння калектыўных авіяцыйных сіл у АДКБ як дадатковага кампанента, які дасць магчымасць праводзіць авіяцыйнае прыкрыццё магчымых аперацый, забяспечыць магчымую перакідку тых або іншых сіл Арганізацыі пры неабходнасці вырашаць якія-небудзь задачы забеспячэння бяспекі. І цяпер працуем над задумай па стварэнні калектыўных сіл спецыяльных аперацый», — расказаў ён.

Акрамя таго, Прэзідэнту была прадстаўлена інфармацыя аб падрыхтоўцы да маючага адбыцца нефармальнага саміту АДКБ, які плануецца правесці ў маі гэтага года ў Кыргызстане. У прыватнасці, размова ішла аб пытаннях, якія неабходна абмеркаваць на сустрэчы прэзідэнтаў. Таксама адбыўся абмен думкамі аб развіцці сітуацыі на прасторы АДКБ у цэлым.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

НА П'ЕДЭСТАЛЕ — ЗДАРОЎЕ

Вольга Пушкарова працуе ў Быхаўскім лясгасе на пасадзе памочніка ляснічага. Сваёй прафесіі вучылася ў Полацкім лясным тэхнікуме 13 гадоў таму. Праца ў лесе стала сапраўдным прызваннем, хоць і марыла ў дзяцінстве быць ветэрынарам. Але ёсць у Вольгі не менш моцнае захапленне — лыжы. Наколькі яно сур'ёзнае для яе, можна лічыць па выніках: у чэмпіянатах па лыжным спорце сярод работнікаў лясной гаспадаркі Беларусі ў Вольгі Пушкаровай паказчыкі адны з лепшых. Сярод жанчын-лыжніц яна другая ў краіне. Штогод абараняе спартыўны гонар не толькі свайго лясгаса, але і Магілёўскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання.

Дасягнуць высокіх вынікаў у спорце Вользе дапамагае самадысцыпліна і сапраўдная ўпартасць — штодня яна прабягае на лыжах па 20 з лішкам кіламетраў. І робіць гэта падчас свайго абедзеннага перапынку — на лыжні каля будынка лясніцтва ў вёсцы Ямнае, у любое надвор'е. Адзінае, што не залежыць ад яе, — снег. Але сёлета з гэтым — сапраўдная раскоша!

— Хачу быць на ўзроўні майстра спорту, — кажа лыжніца. — І хутчэй заняць найвышэйшае месца на п'едэстале!

За дасягненні і імкненне да рэкордаў кіраўніцтва Быхаўскага лясгаса падарыла Вользе камплект лыжаў лепшага еўрапейскага вытворцы.

На фотаздымку: Вольга Пушкарова падчас трэніроўкі каля будынка свайго лясніцтва.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Правілы прызначэння датэрміновых пенсій па ўзросце і датэрміновых прафесійных пенсій за работу ў неспрыяльных умовах працы могуць быць зменены. Такія прапановы міністэрствам у вызначаным парадку ўжо падрыхтаваны і ўнесены. Галоўным чынам яны накіраваны на захаванне для асобных (абмежаваных) катэгорый работнікаў права на датэрміновую пенсію па ўзросце па законе «Аб пенсійным забеспячэнні» за працяглы стаж «шкоднай» працы, набыты да ўвядзення прафесійнага пенсійнага страхавання (да 1 студзеня 2009 года)».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.03.2013 г.

Долар ЗША	8680,00	▲
Еўра	11110,00	▼
Рас. руб.	280,00	▼
Укр. грыўня	1065,42	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 1°
Віцебск	– 1°
Гомель	0°
Гродна	0°
Магілёў	– 1°
Мінск	– 2°

■ Да ведама

РАСПРАЦОЎВАЕЦЦА ДАРОЖНАЯ КАРТА ЭЛЕКТРОННАГА ЎРАДА БЕЛАРУСІ

У нашай краіне створаны геапартал зямельна-інфармацыйнай сістэмы, які забяспечыць шырокі доступ грамадзян, арганізацый і органаў улады да прасторавай інфармацыі. Прасторавыя даныя зямельна-інфармацыйных сістэм дазволяць ажыццяўляць комплексны многафункцыянальны аналіз стану і перспектыў тэрытарыяльнага развіцця, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі.

Гэта дазволіць на базе геапартала фарміраваць матэрыялы статыстычнай справаздачнасці, ажыццяўляць інфармацыйную падтрымку праектам землеўпарадкавання, адводу і вызначэння межаў зямельных участкаў.

Пасля таго, як будзе створана сістэма абароны інфармацыі геапартала і ён атрымае статус прамысловай эксплуатацыі, праз партал плануецца садзейнічаць пры рэгістрацыі правоў на зямельныя ўчасткі. Зараз геапартал тэстуецца экспертамі. Трэба адзначыць, што днямі карэйскія спецыялісты (кампанія Samsung) згадзіліся падзяліцца досведам і перадаваць тэхналогіямі ў галіне электроннага ўрада. У рэйтынгу ААН Рэспубліка Карэя займае першае месца па індэксе развіцця электроннага ўрада.

Сяргей КУРКАЧ

■ На слыху

СПРАСЦІЦЬ, КАБ НЕ СПАЗНІЦЦА

Ці трэба браць у старэйшыя класы ўсіх ахвотных і ўводзіць прафілізацыю навучання? Парламентарыі вырашылі «празандзіраваць» грамадскую думку

Быць ці не быць профільнаму навучанню на старэйшай ступені школы? Якой павінна быць напаўняльнасць класаў і груп падоўжанага дня? Ці трэба ўводзіць абмежаванні па прыёме навучэнцаў у 10-ты клас? Ці ёсць неабходнасць замацоўваць у Кодэксе забарону на прыцягненне педагогаў да дзейнасці, якая не прадугледжана службовай інструкцыяй? Гэтыя і многія іншыя пытанні ўзніміліся падчас выязнога пашыранага пасяджэння Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, якое прайшло на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. У цэнтры ўвагі парламентарыяў і педагагічнай грамадскасці аказалася сістэма агульнай сярэдняй адукацыі.

— Зараз у Беларусі праходзіць маніторынг правапрымяняльнай практыкі Кодэкса ад адукацыі, — паведаміў **старшыня камісіі Генадзь ПАЛЬЧЫК.** — Члены нашай камісіі таксама падключыліся да маніторынгу. Для гэтага мы праводзім серыю пашыраных пасяджэнняў са спецыялістамі розных узроўняў адукацыі, сустракаемся з дырэктарамі школ, прадстаўнікамі органаў кіравання адукацыі, радавымі педагогамі. І ў нас ужо зафіксаваны шэраг праблемных пазіцый, якія патрабуюць перагляду. Восенню мы плануем выйсці на фармат парламенцкіх слуханняў, па выніках якіх будуць прымацца рашэнні аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у дзеючы Кодэкс. Але варта мець на ўвазе: якія папраўкі мы не ўнеслі б сёння, жыццё настолькі імкліва змяняецца, што ўсяго праз два—тры гады нам, магчыма, зноў давядзецца штосьці карэктаваць. Таму я лічу, што трэба стварыць такі механізм, каб усе змяненні на перспектыву не вымагалі шматступеньчатага зацвярджэння, бо ёсць рызыка, што пакуль гэтыя змяненні будуць прымацца, яны ўжо страцяць сваю актуальнасць. Трэба дакладна прадумаць, якія з прапаноў замацоўваць у Кодэксе, а што можна прапісаць на ўзроўні галіновых нарматыўных прававых актаў, якія значна прасцей будзе адкарэктаваць.

ЗНЕШНЯЯ АТЭСТАЦЫЯ — ГЭТА НЕ ЦТ

Парламентарыі не ўтойваюць, што найбольшая колькасць карэкціровак тычыцца менавіта сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі. І бадай што прынцыповым пытаннем з'яўляецца вяртанне да ідэі прафілізацыі старэйшай ступені школы. Нагадаем, што Кодэксам аб адукацыі прадугледжваецца магчымасць вывучэння прадметаў як на базавым, так і на павышаным узроўнях. Аднак на сённяшні дзень павышаны ўзровень рэалізуецца выключна за кошт факультатыўных заняткаў. Час паказаў, што назваць гэты механізм дзейсным наўрад ці можна. Выкладчыкі ВНУ канстатуюць, што большая частка набраных у ВНУ студэнтаў абсалютна неадукаваныя ў базавых для інжынернай падрыхтоўкі школьных прадметах, перш за ўсё такіх, як фізіка і матэматыка. Таму ў беларускіх ВНУ нават вымушаны ўводзіць спецыяльныя курсы — каб хоць крыху падцягнуць слаба падрыхтаваных першакурснікаў да ўзроўню вышэйшай школы.

Абсалютная большасць педагогаў выказваюцца за вяртанне да вывучэння асобных вучэбных прадметаў у 10—11-х класах на павышаным узроўні ва ўрочны час. Праўда, з адной агаворкай: паралельна з фізіка-матэматычным ці гуманітарным профілямі трэба пакінуць магчымасць для дзяцей, якія не могуць вызначыцца з выбарам, і так званы агульны профіль. Тым больш што не ўсе навучэнцы здольныя засвойваць змест таго ці іншага прадмета на паглыбленым узроўні. Але з гэтага пытання аўтаматычна вынікае і іншае: а ці трэба браць у старэйшыя класы ўсіх ахвотных? СТАР. 2

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 красавіка 2013 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца адкрыццё другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Другая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу **2 красавіка 2013 года ў 10 гадзін** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала). Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **2 красавіка 2013 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЗША НАКІРАВАЛІ Ў КАРЭЮ Б-52

Два стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі Б-52 ВПС ЗША, здольныя несці ядзерную зброю, вылецелі з амерыканскай ваеннай базы Wightman ў Паўднёвую Карэю.

«Стратэгічнае ваеннае камандаванне ЗША накіравала 2 бамбардзіроўшчыкі Б-52 Spirit для ажыццяўлення трэніровачнага доўгага палёту з наступным вяртаннем з базы ВПС ЗША Whiteman у рамках штогадовых сумесных вучэнняў ЗША і Паўднёвай Карэі Foal Eagle («Малады арол»)», — гаворыцца ў распаўсюджанай заяве амерыканскага ваеннага камандавання ў Паўднёвай Карэі. Пры гэтым бакі «пацвердзілі непарушнасць саюза» паміж імі, які «з'яўляецца інструментам падтрымання стабільнасці на Карэйскім паўвостраве». Гэтая дэманстрацыя ваеннай магутнасці адбылася ва ўмовах бесперапынных ваенных пагроз з боку Пхеньяна на адрас ЗША і Паўднёвай Карэі.

ПУЦІН ЗАГАДАЎ ПАЧАЦЬ РАПТОЎНЫЯ ВУЧЭННІ

Прэзідэнт і Вярхоўны галоўнакамандуючы Расіі Уладзімір Пуцін 28 сакавіка а чацвёртай гадзіне раніцы аддаў загад правесці буйнамаштабныя вучэнні ў раёне Чорнага мора. Асноўная мэта — праверыць боегатоўнасць і зладжанасць дзеянняў асабовых падраздзяленняў. Пуцін аддаў загад аб пачатку раптоўных ваенных вучэнняў у раёне Чорнага мора з борта самалёта на шляху з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ў Маскву. Усяго ў вучэннях будзе задзейнічана да сямі тысяч салдат і афіцэраў, 36 караблёў, войскі хуткага разгортвання, ВДВ, а таксама сілы спецыяльнага прызначэння.

НАПАДЫ ХАКЕРАЎ ЗАМАРУДЗІЛІ ІНТЭРНЭТ

Найбуйнейшая кібератака прывяла да запаволенай працы інтэрнэту ў шматлікіх месцах Зямлі. Эксперты ўжо назвалі яе адной з самых маштабных у гісторыі. Паведамляецца, што хакерская атака пачалася яшчэ ў сярэдзіне сакавіка і паступова ўзрастала. Прычынай стаў канфлікт паміж актывістамі дзвюх груп: якая базуецца ў Лондане і Жэневе — Spamhaus — і нідэрландскай Cyberbunker. Першыя займаюцца барацьбой са спамам, другія, наадварот, дапамагаюць карыстальнікам размяшчаць інфармацыю на розных сайтах. Cyberbunker абвінаваціў апанентаў у злоўжыванні паўнамоцтвамі, заявіўшы, што ім нельга вырашаць «што дазволена, а што не дазволена размяшчаць у інтэрнэце». У сваю чаргу Spamhaus абвінавацілі Cyberbunker у супрацоўніцтве са злачыннымі групоўкамі з Усходняй Еўропы, якія, на іх думку, і стаяць за буйной кібератакай. Хакерская атака пашкодзіла найбуйнейшыя сусветныя сеткі і пункты абмену інтэрнэт-трафікам. Колькасць заражаных інтэрнэт-сетак і аб'ектаў вылічаецца сотнямі тысяч, калі не мільёнамі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НА КІПРЫ ЎЗМАЦНЯЮЦЬ МЕРЫ БЯСПЕКІ

На Кіпры ў чаканні аднаўлення работы банкаў, якія былі зачынены амаль два тыдні, прыняты ўзмоцненыя меры бяспекі.

Кіпрскія банкі, закрытыя з 16 сакавіка, аднавілі працу ў чацвер у 12:00 па мясцовым часе. На ахову парадку была выведзена паліцыя. У ноч на чацвер у будынак Цэнтральнага банка Кіпра ў Нікасіі былі прывезены наяўныя грошы. Іх транспартавалі ў некалькіх грузавіках пад узмоцненай узброенай аховай з верталётам. Па новых правілах ва ўсіх банкаматах краіны можна будзе зняць да 300 долараў штодзень. Акрамя таго, 27 сакавіка было абвешчана, што фізічным асобам будзе забаронена вывозіць з Кіпра за мяжу больш за 1000 еўра наяўнымі, а таксама траціць за мяжой з картак кіпрскіх банкаў больш чым 5000 еўра за месяц.

Абмежаванні на зняцце сродкаў былі ўведзены з-за таго, што ўлады асцерагаюцца вываду капіталу з банкаў краіны. У ноч на 25 сакавіка ўлады Кіпра дамовіліся аб атрыманні фінансавай дапамогі ў памеры 10 мільярдаў еўра ад міжнародных крэдытораў. Па ўмовах пагаднення, у краіне будзе праведзена рэструктурызацыя банкаў. Плануецца, што сродкі з рахункаў да 100 тысяч еўра спісваць не будуць, а з больш буйных рахункаў, наадварот, будуць спісаныя пэўныя сумы. Па розных ацэнках, з буйных рахункаў будзе канфіскавана да 40 або нават 80% сродкаў.

КАРАТКА

Па колькасці насельніцтва Беларусь займае 89-е месца ў свеце і 18-е месца ў Еўропе. У сярэднім на адным квадратным кіламетры Беларусі пражывае 46 жыхароў. Сярод рэгіёнаў найменш густанаселенай з'яўляецца па-ранейшаму Віцебская вобласць — 30 чалавек, а ў Мінску гэты паказчык перавысіў 6192 чалавекі на 1 кв. км.

Міністр гандлю Валянцін Чаканаў назначаны прадстаўніком дзяржавы ў органах кіравання ААТ «Белінвестбанк».

Маладая беларуская піяністка Вольга Сцяжко выступіла ў зале Карто ў Парыжы. Наша суайчыннiца з'яўляецца лаўрэатам першай прэміі Міжнароднага конкурсу піяністаў імя Артура Рубінштэйна, першай прэміі Міжнароднага конкурсу піяністаў імя Галіны Чорны-Стафаньскай.

Цмок — беларускі дракон, стане сімвалам Лепельскага краю. Міні-праект па стварэнні турыстычнага брэнда раёна атрымаў фінансавую падтрымку праграмы ЕС «Вада, прырода, людзі ў знікаючым ландшафце: развіццё ўстойлівага сельскага турызму ў Расіі і Беларусі».



СЕЗОННАЯ ЗАБАРОНА НА ЛОЎЛЮ РЫБЫ

з 1 красавіка па 30 мая

Сезонная забарона на лоўлю рыбы будзе дзейнічаць ва ўсіх рыбалоўных угоддзях Беларусі

ДАЗВАЛЯЕЦЦА АМАТАРСКАЕ РЫБАЛОЎСТВА

у светлы час сутак

або адным спінінгам

з берага

аснашчаным штучнай прынадай

адной вудачкай з адным кручком

з адным адзінарным, двайным або трайным кручком размерам не больш за № 10

ШТРАФ* ЗА НЕЗАКОННУЮ РЫБНУЮ ЛОЎЛЮ:

для грамадзян - **ад 10 да 50 базавых** велічынь з канфіскацыяй прылады лоўлі,

для індывідуальных прадпрымальнікаў - **ад 50 да 200 базавых** велічынь,

для юрыдычных асоб - **ад 500 да 1000 базавых** велічынь (цяпер адна базавая велічыня роўная Br100 тыс.).

*У дадатак да штрафу парушальнікам забароны неабходна будзе выплаціць суму, у якую спецыялісты ацэняць нанесеную навакольнаму асяроддзю шкоду.

Крыніца: Мінпрыроды Беларусі. © Інфаграфіка БЕЛТА

■ Парламенцкі дзённік

ІДЭАЛЬНАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

У вясновую сесію, якая днямі адкрыецца ў парламенце, плануецца прыняць у першым чытанні два законапраекты, якія выклікалі рэзананс у айчынным бізнэс-асяроддзі: аб унясенні змяненняў па пытаннях гаспадарчых таварыстваў і аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці. Пра асаблівасці гэтых дакументаў і іх мэты «Звязде» расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Уладзімір КРАЎЦОЎ.

Пастаянная камісія па эканамічнай палітыцы створана ў 5 скліканні Палаты прадстаўнікоў упершыню. У яе кампетэнцыі пытанні агульнага характару рэгулявання і кіравання эканомікай, дзяржаўныя праграмы развіцця рэспублікі і рэгіёнаў, заканадаўства ў сферы прадпрымальніцтва, кіравання дзяржаўнай маёмасцю, дзяржаўны заказ і заканадаўства аб банкруцтве.

— Мы завяршаем працу над законапраектам аб інвестыцыях, які таксама плануем прыняць на вясновай сесіі, — сказаў Уладзімір Краўцоў. — Працуем над абнаўленнем закона аб канцэсіях. Яшчэ адно цікавае пытанне — дзяржаўна-прыватнае партнёрства. Ужо распрацавана канцэпцыя і маецца праект закона, над якім працуе ў тым ліку і наша камісія.

Законапраекты «Аб унясенні змяненняў у некаторыя законы па пытаннях гаспадарчых таварыстваў» і «Аб унясенні змяненняў у Закон «Аб прыватызацыі» паступілі ў камісію пакетам параўнальна нядаўна. Яны закранаюць вельмі шырокі спектр пытанняў. Напрыклад, у законапраекце аб гаспадарчых таварыствах замацоўваецца магчымасць стварэння і дзейнасці гаспадарчага таварыства з адным заснавальнікам. Дагэтуль такой нормы не існавала, і калі заставаўся адзін заснавальнік, таварыства трэба было параўтвараць, што звязана з дадатковымі выдаткамі.

Яшчэ адна цікавая навацыя — увядзенне інстытута акцыянерных пагадненняў. Гэта таксама цывілізаваны падыход да дзейнасці акцыянерных таварыстваў, які дапамагае здымаць вельмі шмат супярэчнасцяў, лічыць старшыня камісіі.

У законапраекце аб гаспадарчых таварыствах таксама прадугледжаны дазвол не ўтвараць савет дырэктараў (назіральны савет) на тых прадпрыемствах, на якіх больш за палову статутнага фонду належыць дзяржаве. Удакладняюцца падставы для аспрэчвання ў судзе рашэнняў, якія былі прынятыя радай дырэктараў, назіральнай радай або выканаўчым органам з парушэннем заканадаўства. Законапраект прадугледжвае адказнасць членаў кіруючых органаў за рашэнні, якія прывялі да эканамічных страт.

Наша перавага ў тым, што мы можам улічыць чужыя памылкі, каб пазбегнуць іх.

Старшыня камісіі падкрэсліў, што законапраект аб прыватызацыі закліканы ўдасканаліць механізм уладальніцкага назірання. Яшчэ адно важнае новаўвядзенне — інстытут дзяржаўных прадстаўнікоў для абароны правоў мінарытарных акцыянераў (памер пакета акцый якіх меншы за 2%). Па звестках Дзяржкаммаёмасці, у Беларусі налічваецца прыкладна 5 000 акцыянерных таварыстваў, дзе ўладальнікамі з'яўляюцца працоўныя калектывы, якія маюць зусім невялікія долі акцый. Большасць з іх не наведвае сходы акцыянераў і не ўдзельнічае ў кіраванні таварыствам. Новы механізм прадугледжвае, што калі мінарытарным акцыянерам было належным чынам паведамлена аб сходзе, але яны не прыйшлі на яго, ад іх імя будзе галасаваць прадстаўнік дзяржавы.

— Пытанні прыватызацыі вельмі складаныя і закранаюць кожнага з грамадзян, таму ўсе працэсы тут павінны быць празрыстымі і справядлівымі, — лічыць дэпутат. — Гэта — у ідэале. У жыцці ўсё больш складана, але мы павінны імкнуцца да ідэала. Я працаваў у бізнэсе і назіраў, як прыватызацыя адбывалася ў Расійскай Федэрацыі, ва Украіне, калі там яшчэ не была для яе створана сур'ёзная заканадаўчая база. Сёння сітуацыя там значна выраўнялася. Наша перавага ў тым, што мы можам улічыць чужыя памылкі, каб пазбегнуць іх.

Галоўная мэта новых законаў — садзейнічанне фінансавай устойлівасці беларускіх прадпрыемстваў, падкрэслівае Уладзімір Краўцоў. «Для таго, каб новыя тэхналогіі запрацавалі і далі эканамічны эфект, нам трэба мадэрнізаваць не толькі абсталяванне, але і кіраванне прадпрыемствамі. Наша эканоміка адкрытая, мы не можам замыкацца ад астатняга свету. Мы будзем развіваць рынак каштоўных папер, выходзіць на замежныя рынкі, да нас будуць прыходзіць замежныя інвестары са сваім падыходам у кіраванні, і мы павінны пераймаць усё перадавое, — сказаў ён. — На многія законапраекты мы глядзім праз прызму Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. Напрыклад, мы разглядаем змены ў закон аб свабодных эканамічных зонах, каб зрабіць ільготы для рэзідэнтаў гэтых зон універсальнымі для ўсіх членаў АЭП».

На пытанне «Звязды» аб тым, узмацняюць альбо аслабляюць дзяржаўны кантроль у эканамічнай сферы названыя законапраекты, старшыня парламенцкай камісіі адназначна адказваць не стаў. Увядзенне інстытута дзяржаўных прадстаўнікоў, безумоўна, сведчыць пра ўзмацненне кантролю, але магчымасць дзеяння гаспадарчага таварыства з адным заснавальнікам дае бізнэсу больш свабоды. «Разам усе гэтыя новаўвядзенні дазволяць больш эфектыўна працаваць — гэта шлях да лібералізацыі эканомікі, шлях наперад», — не сумняваецца заканатворца.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

Кіраўніцтва і калектыў Упраўлення ДАІ і спецпадраздзялення ДПС «Страла» МУС Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні начальніку Упраўлення ДАІ МУС Рэспублікі Беларусь Юрыю Аляксандравічу Літвіну ў сувязі з горам, якое яго напаткала, — смерцю БАЦЬКІ.

Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні начальніку Упраўлення ДАІ МУС Рэспублікі Беларусь Юрыю Аляксандравічу Літвіну ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.

СПРАСЦІЦЬ, КАБ НЕ СПАЗНІЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У нас у краіне абавязковая — дзевяцігадовая базавая адукацыя, таму, напэўна, у старэйшыя класы павінны прыходзіць толькі тыя вучні, якія не проста жадаюць, але і могуць засвойваць вучэбную праграму. А калі няма ні жадання навучацца, ні імкненняў, ні здольнасцяў? Школа ўсё ж такі не «камера захоўвання»...

І зноў жа, калі ўводзіць абмежаванні па прыёме ў 10-ты клас, то якім чынам гэта трэба рабіць? Можна вырашыць праблему адбору лепшых зацвярджэннем кантрольных лічбаў прыёму ў 10-ты клас. А можна ўвесці нейкі «прахадны» бал (сярэдні бал атэстата), і тым, у каго вынікі вучэбнай дзейнасці за дзявяты клас будуць ніжэйшыя, давядзецца падумаць пра выбар прафесіі. Але ж самі педагогі і канстатуюць, што «вага» адных і тых жа адзнак, якія выстаўляюцца ў розных школах, можа быць рознай. Установы адукацыі проста захліснула «працэнтаманія» добрых адзнак.

— Давайце паглядзім, чые подпісы стаяць пад пасведчаннем аб заканчэнні базавай школы, — прапанаваў Генадзь Пальчык. — Кіраўніка школы, завуча, класнага кіраўніка... Дзяцей атэстоўваюць тыя ж людзі, якія іх і навучаюць. Між іншым, у многіх краінах свету праводзіцца знешні дзяржаўны экзамен, які з'яўляецца адным з крытэрыяў для паступлення на іншы ўзровень адукацыі. Магчыма, і нам трэба вырашаць далейшы лёс выпускнікоў базавай школы на падставе дзяржаўнай знешняй атэстацыі, вынікі якой не будуць залежаць ні ад настаўніка, ні ад школы, ні ад інтарэсаў таго ці іншага рэгіёна.

Цікава, што выніковая знешняя атэстацыя пасля базавай школы не выклікае ў педагогаў такога аднадушнага стаўлення, як, скажам, магчымасць адсейвання заведама слабых вучняў на ўваходзе ў 10-ты клас. І аргументацыя гучыць даволі дзіўная: маўляў, гэта будзе негуманна ў дачыненні да дзяцей, бо дзеці нервуюцца на экзаменах нават у прысутнасці педагогаў, якіх яны добра ведаюць. Псіхіка ў падлеткаў яшчэ няўстойлівая, і з гэтым стрэсам яны і ўвогуле могуць не справіцца. Чаму трэба ўводзіць выніковую знешнюю атэстацыю пасля базавай школы, а не пасля 11-га класа? Прадстаўнікі сталічнага Камітэта па адукацыі нават прыгадалі няўдалую спробу сумяшчэння цэнтралізаванага тэсціравання з выпускнымі іспытамі, якая была негатыўна сустрэта грамадскасцю. Чамусьці ва ўяўленні многіх знешняя атэстацыя асацыюецца менавіта з цэнтралізаваным тэсціраваннем.

— Цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта рэйтынгавая сістэма, якая ні ў якім разе не можа выконваць ролю атэстацыйнага экзамену, — патлумачыў Генадзь Пальчык. — У рэйтынгавай сістэмы ацэньвання зусім іншыя мэты.

Начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Святлана УКЛЕЙКА паведаміла, што зараз на заказ міністэрства ў Нацыянальным інстытуце адукацыі выконваецца навукова-даследчая работа, у рамках якой прапрацоўваюцца мадэль і механізмы знешняй атэстацыі за базавую школу.

— Гэта зусім не азначае, што ўжо ў будучым навучальным годзе мы будзем гатовыя яе ўкараніць. Такое сур'ёзнае пытанне яшчэ патрабуе шырокага грамадскага абмеркавання. Разглядаецца таксама і мэтазгоднасць пераносу выпускнога экзамену па гісторыі з базавай у сярэднюю школу...

Таксама Святлана Уклейка не выключае, **што ўжо з 1 верасня дзесяцікласнікі беларускіх школ змогуць вывучаць асобныя прадметы на паглыбленым узроўні — прынамсі, зараз у міністэрстве разглядаецца такая магчымасць і рыхтуецца праект адпаведнага дакумента...**

ГІМНАЗІІ: ЗАЛІЧВАЕМ УСІХ?

Асобна парламентарыі і прадстаўнікі педагагічнай грамадскасці закранулі пытанне функцыянавання гімназій. Напрыклад, ці варта ўводзіць ніжні бал для тых, хто паступае ў гімназічныя класы? Гэтае пытанне ўзнікла не на пустым месцы — практычна ў кожнай трэцяй гімназіі конкурсу летась амаль не было (1,1 чалавека на месца ці менш чым 1 чалавек на месца). Пры гэтым каля

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

17% гімназій залічылі навучэнцаў з прахадным балам менш як 36, гэта значыць, што будучыя гімназісты мелі менш як 6 балаў па кожным з вучэбных прадметаў. Пра якую канкурэнтаздольнасць такіх устаноў можа весціся гаворка?

Можна думаць, што пры фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму ў 5-я класы гімназій аддзелы і ўпраўленні адукацыі не аналізуюць сітуацыю і зацвярджаюць лічбы, зыходзячы з пазіцый захавання складу педагагічнага калектыву, а не кіруючыся якасцю адукацыі... І як у такім разе быць?

Аднак ідэя аб увядзенні ніжняй прахадной планкі пры паступленні ў гімназіі ўсе ж такі ўхвалення ў педагогаў не знайшла. Больш аднадушнымі былі педагогі ў прадастаўленні права паступлення ў гімназію без уступных іспытаў пераможцам тэлевізійных віктарын-конкурсаў, раённых і абласных алімпіяд. Сёння пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд могуць без экзаменаў паступіць у ліцэі, а вось пры паступленні ў гімназію іх абавязкова папросяць здаць уступныя іспыты... Трэба гэтую недапрацоўку ліквідаваць.

Таксама педагогі лічаць мэтазгодным пры прыёме ў пяты клас гімназіі ўлічваць не толькі вынікі ўступных экзаменаў па беларускай, рускай мовах і матэматыцы і адзнакі па гэтых прадметах за чацвёрты клас, але і сярэдні бал выніковай атэстацыі за чацвёрты клас, пакольк і іншыя школьныя прадметы для развіцця дзіцяці таксама не менш важныя.

Не прапісаны сёння нідзе і ўмовы пераводу дзіцяці з гімназію ў гімназію. Калі, напрыклад, сям'я змяняе месца жыхарства, што рабіць дзіцяці: ісці ў звычайную сярэднюю школу або зноў здаваць экзамены ў гімназію?

Якія яшчэ дапаўненні прапануецца змацаваць у Кодэксе аб адукацыі:

— магчымасць арганізацыі адукацыйнага працэсу на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў малакамплектных школах у складзе класа-камплекта;

— забарону на прыцягненне педагогаў да дзейнасці, якая не прадугледжана службовай інструкцыяй;

— забарону на прыцягненне навучэнцаў да ўдзелу ў іншых мерапрыемствах у час урокаў;

— матэрыяльную адказнасць законных прадстаўнікоў навучэнцаў за псаванне будынкаў, абсталявання і іншай маёмасці ўстановы адукацыі навучэнцамі;

— адказнасць законных прадстаўнікоў навучэнцаў за невыкананне сваіх абавязкаў, замацаваных у Кодэксе аб адукацыі;

— магчымасць выкарыстання педагагічнымі работнікамі «метадычнага дня»

— абавязковая гутарка з абітурыентамі педагагічных ВНУ з мэтай вызначэння іх прафесійнай прыдатнасці.

24 ВУЧНІ — ПОЎНЫ КАМПЛЕКТ

Дырэктар ашмянскай сярэдняй школы № 1 Міхаіл ГРУЖЭЎСКІ засяродзіў увагу калег яшчэ на адной праблеме:

— Згодна з Кодэксам аб адукацыі, дысцыплінарнае спагнанне можна прымяняць да навучэнца толькі з 14 гадоў. Але з 14 гадоў наступае ўжо крымінальная адказнасць па асобных відах злачынстваў. Са свайго педагагічнага досведу мы цудоўна ведаем, што ў 10—11-м класах заўвага або вымова, зробленыя вучням, ужо не маюць таго ж эфекту, як, скажам, у пяці- ці сямікласнікаў. Таму я лічу, што ўзрост, калі можна прымяняць да вучня меры дысцыплінарнага спагнання, трэба знізіць да 11 гадоў. Да таго ж трэба спрасціць і саму працэдуру аб'яўлення заўвагі, бо сёння, калі кіравацца нормамі Кодэкса, прасцей зняць дырэктара школы з работы, чым аб'явіць вучню заўвагу.

На думку Міхаіла Гружэўскага, абавязкова трэба захоўваць пераемнасць паміж напаўняльнасцю класаў у пачатковай і сярэдняй школе:

— Пагадзіцеся, што калі з пяці чацвёртых класаў робяць чатыры пятыя класы, то гэты працэс вельмі хваравіта ўспрымаецца і вучнямі, і іх бацькамі.

Згодна з Кодэксам, у 1—4-х класах устаноўленая напаўняльнасць складае 20 вучняў, а ў 5—9-х класах — 25 чалавек. Ёсць прапанова ўстанавіць агульны для ўсіх устаноў агульнай сярэдняй адукацыі нарматыў напаўняльнасці класаў і груп падоўжанага дня — не больш як 24 вучні. Даказана, што залежнасць якасці адукацыі ад колькасці навучэнцаў прысутнічае толькі калі ў класе навучаюцца да 10-14 чалавек, а пры большай колькасці вучняў такі эфект ужо не прасочваецца, і не мае значэння —15, 20 ці 25 вучняў будзе ў класе. Але калі з максімальным нарматывам 24 вучні ў класе педагогі, як правіла, пагаджаюцца, то што датычыцца груп падоўжанага дня, пэўная частка педагогаў просяць не вызначаць ніжні нарматыў. Уся праблема ў тым, што ў сельскай мясцовасці, дзе дзеці залежаць ад школьных аўтобусаў, у групах падоўжанага дня могуць знаходзіцца і да 10 выхаванцаў. Ёсць меркаванне таксама, што напаўняльнасць класаў павінна вызначацца заснавальнікам установы адукацыі, у ролі якога, як правіла, выступаюць мясцовыя органы ўлады.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Здарэнне

ВЫБУХ НА СПІРТЗАВОДЗЕ: ЁСЦЬ АХВЯРА

У выніку выбуху ў пасёлку Лынтупы Пастаўскага раёна на мясцовым спіртзаводзе ад атрыманых траўмаў адна работніца гэтага прадпрыемства памерла, яшчэ дзве жанчыны і мужчына былі параненыя.

— А трэцяй гадзіне дня паступіла паведамленне аб надзвычайнай сітуацыі ў цэху рэктыфікацыі на тэрыторыі РУП «Лынтупскі спіртзавод». Па прыбыцці да месца выкліку падраздзяленняў МНС назіралася гарэнне на 1-м паверсе 5-павярховага жалезабетоннага будынка, абвальванне лесвічных маршаў уздоўж тэхналагічных калон, — паведамілі ў прэс-службе Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. — Высветлілася, што ў цэху па рэктыфікацыі спірту адбыўся выбух металічнай ёмістасці з сівушным спіртам з наступным гарэннем спірту. Атрымалі траўмы рознай ступені цяжару 4 чалавекі: тры жанчыны і мужчына. Брыгадамі хуткай медыцынскай дапамогі яны былі дастаўлены ў Пастаўскую цэнтральную раённую бальніцу. Як стала вядома пазней, адна з пацярпелых памерла ў бальніцы.

Вельмі хутка пажар быў ліквідаваны. Прычына таго, што адбылося, устанаўліваецца.

Паводле слоў Уладзіміра Чэкавага, галоўнага ўрача Пастаўскай цэнтральнай раённай бальніцы, пацярпелым пры выбуху на прадпрыемстве аказваецца інтэнсіўная медыцынская дапамога. З Віцебска выклікалі брыгаду медыкаў, у тым ліку нейрахірурга. Адна з пацярпелых знаходзіцца ў рэанімацыі. Яшчэ двое — у хірургічным аддзяленні. Паводле слоў медыкаў, пагрозы іх жыццю няма.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

■ Меркаванне

НЕ БЫЦЬ РАНЦЬЕ, НЕ ПЕРАЙМАЦЬ ЗАХАД

Цікавы артыкул з'явіўся ў рускамоўным інтэрнэце ў мінулым месяцы. Віталь Траццякоў у сваім артыкуле «Чаму ў нас нічога не атрымліваецца? І не атрымаецца, калі так будзем і далей дзейнічаць. Што ёсць Расія?» прапанаваў механізм па ўсталяванні рэальнай справядлівасці, які падштурхне расійскае грамадства да аб'яднання з уладай. Сутнасць яго проста: «аддаць кожнаму яго законную частку нацыянальных прыродных багацццяў». Аўтар прапануе перадаць кожнаму грамадзяніну Расіі права на частку нацыянальных багацццяў Расіі, г.зн. на пэўную колькасць зямлі, вады, драўніны, нафты, газу, золата і брыльянтаў.

Але тут адразу ж магчымыя наступныя праблемы.

Па-першае, робячы такую прапанову, аўтар бачыць перспектывы развіцця Расіі ў эксплуатацыі прыродных багацццяў краіны. Насамрэч гэта тупіковы шлях. Расія ўжо стала сыравінным прыдаткам Еўрасаюза, як раней сыравіннымі прыдаткамі Захаду сталі Кувейт і Саудаўская Аравія. Шлях з мноствам небяспек. Адну з іх наглядна прадэманстравалі нядаўнія праблемы з Грэцыяй у Еўрасаюзе. Фінансавыя непарадкі ў 11-мільённай краіне, якая ўваходзіць у Еўрасаюз, выклікалі з-за асцярогі падзення попыту на расійскую сыравіну па ўсім ЕС імклівы абвал каціровак расійскага рубля да долара і еўра — больш чым на 20% за некалькі месяцаў 2011 года. Нават на гэтым простым прыкладзе відаць уразлівасць 143-мільённай краіны з самай вялікай у свеце тэрыторыяй з-за арыентацыі на сыравінныя рэсурсы.

Другой праблемай з'яўляецца бурнае развіццё нанатэхналогій і біятэхналогій. Не так ужо і далёка той дзень, калі, каб зрабіць новую прадукцыю, больш не будзе неабходнасці закупляць нафту або метал у Расіі. Дастаткова будзе зачарпнуць рыдлёўкай зямлі на сваім заднім двары і кінуць яе ў апарат. І на аснове нана- і біятэхналогій апарат раскладзе гэтую зямлю на малекулы і атамы і зробіць з іх новую кашулю, шыну, цацку — і яшчэ дзясяткі тысяч іншых тавараў, якія цяпер вырабляюць, закупляючы сыравіну. Што тады будуць рабіць краіны, якія цалкам завязалі сваю эканоміку на экспарт сыравіны?

Па-трэцяе, такая рэформа зробіць з грамадзян Расіі ранцье. Яны будуць сядзець і спадзявацца на цуд, на тое, што на сусветным рынку паражэюць альбо нафта, альбо золата, і яны стануць багатымі. Але людзі з псіхалогіяй ранцье не могуць зрабіць нічога добрага для сваёй краіны. Такія ранцье ў Расіі ўжо ёсць — сыравінныя алігархі, якія атрымалі ў 1990-х велізарныя прыродныя багацці пад свой кантроль і з тых часоў эксплуатуюць іх без крэатыўнасці, здымаючы штогадовую прыродную рэнту. Менавіта падобнага тыпу бізнэсменаў цяперашні прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў ахарактарызаваў наступным чынам у 2009 годзе ў сваёй прамове «Расія, наперад!», гаворачы пра «прадпрымальнікаў», якія нічога не прадпрымаюць». Яны добра ўладкаваліся. У іх «усё ёсць». Іх усё задавальняе. Яны збіраюцца да сканчэння веку выціскаць даходы з рэшткаў савецкай прамысловасці і разбазарваць прыродныя багацці, якія належаць усім нам». Каб дасягнуць поспеху ў глабальнай канкурэнцыі XXI стагоддзя, Расіі патрэбны не ранцье, а энергічныя, мэтанакіраваныя грамадзяне, якія добрасумленна працуюць на свае і агульнанародныя перспектывы.

Дастаткова будзе зачарпнуць рыдлёўкай зямлі на сваім заднім двары і кінуць яе ў апарат. І на аснове нана- і біятэхналогій апарат раскладзе гэтую зямлю на малекулы і атамы і зробіць з іх новую кашулю, шыну, цацку. Што тады будуць рабіць краіны, якія цалкам завязалі сваю эканоміку на экспарт сыравіны?

Цяжка пагадзіцца і з пазіцыяй аўтара аб тым, што галоўным пытаннем развіцця Расіі ў цяперашні момант з'яўляецца выбар паміж перайманнем Захаду і стварэннем «альтэрнатыўнага Захаду». Трагедыяй як СССР, так і цяперашняй Расіі з'яўляецца зацыкліванне на тым, што часта ўжо не з'яўляецца актуальным. І СССР можна было выратаваць, і цяперашнюю Расію трэба мадэрнізаваць, арыентуючыся зусім не на Захад або натхнёна абстрактную альтэрнатыўную мадэль. І тады, і цяпер, быў арыенцір, на які не звярнулі ўвагі. І дарэмна. Пачаўшы першыя рэформы ў сферы сельскай гаспадаркі ў канцы 1970-х, Кітай з краіны галадаючых стаў за некалькі гадоў буйным экспарцёрам прадуктаў харчавання. Проста дазволіўшы сялянам браць зямлю, наймаць працаўнікоў і свабодна прадаваць вырабленую сельгаспрадукцыю ў гарадах. У далейшым пачаліся рынкавыя рэформы ў прамысловасці — замест прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў (шлях Расіі ў 1990-х, які прывёў да знішчэння і дэградацыі большасці з іх), Кітай вылучыў месца для паралельнага стварэння побач з дзяржаўным сектарам новых айчынных і замежных прыватных фабрык. У выніку стаў падвойваць прамысловы патэнцыял кожныя некалькі гадоў. Калі б Гарбачоў пачаў рэформы не з перайманння Захаду і знішчэння савецкай ідэалогіі, а проста крэатыўна ўкараніў перадавы кітайскі досвед у эканоміцы, то ў СССР да канца 1980-х былі б на прылаўках крам не запыленыя галёшы 46-га памеру, а па трыццаць гатункаў каўбасы і сыру. Тым самым здымаючы адзін з галоўных папрокаў да савецкай улады ў насельніцтва.

І цяпер яшчэ не позна вучыцца ў Кітая. Як гэта робіць ліхаманкава Захад, спрабуючы ўратавацца ад краху, паколькі заходні эканамічны крызіс у якасці галоўнай сваёй прычыны мае рэзка ўзрослую канкурэнцыю з боку кітайскай прадукцыі. Тое ж варта рабіць і Расіі. Шляхі досыць простыя — не дзяліць прыбытак ад экспарту сыравінных рэсурсаў паміж нешматлікімі або шматлікімі ранцье, а накіроўваць яго на стварэнне новых высокатэхналагічных прадпрыемстваў, што вырабляюць канкурэнтаздольную прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю. Што, уласна, сёння робіць і Кітай — на грошы, зароблены ад экспарту тавараў прамысловай групы.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук

■

ПТ ОАО «Управляющая компания холдинга «БелГАЗавтосервис»

Учетный номер плательщика: 100123046
Вид экономической деятельности: 74150
Организационно-правовая форма: Открытое акционерное общество
Орган управления
Единица измерения: млн руб.
Адрес: 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 25, комн. 318

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2012 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	48173	27877
Нематериальные активы	120		
Доходные вложения в материальные активы	130	-	1278
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	1278
Вложения в долгосрочные активы	140	7602	12
Долгосрочные финансовые вложения	150	2881	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
Итого по разделу I	**190**	**58656**	**29167**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	3105	6891
в том числе:			
материалы	211	2365	836
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	740	5018
товары отгруженные	215	-	1037
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	1675	164
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	243	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	14396	20428
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	657
Денежные средства и их эквиваленты	270	262	219
Прочие краткосрочные активы	280	-	4
Итого по разделу II	**290**	**19681**	**28363**
БАЛАНС	**300**	**78337**	**57530**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	222	222
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	11	8
Добавочный капитал	450	67583	38519
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	1486	2210
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
Итого по разделу III	**490**	**69302**	**40959**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	7850
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
Итого по разделу IV	**590**	**-**	**7850**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	617
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	8877	7269
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	532	4122
по авансам полученным	632	190	450
по налогам и сборам	633	522	1178
по социальному страхованию и обеспечению	634	99	27
по оплате труда	635	240	152
по лизинговым платежам	636	15	100
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	6	20
прочим кредиторам	638	7273	1220
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	158	835
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
Итого по разделу V	**690**	**9035**	**8721**
БАЛАНС	**700**	**78337**	**57530**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2012 год

Наименование показателей	Код строки	За 2012 год	За 2011 год
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	30512	62931
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	9666	45896
Валовая прибыль (010 - 020)	030	20846	17035
Управленческие расходы	040	16603	-
Расходы на реализацию	050	184	12413
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 - 040 - 050)	060	4059	4622
Прочие доходы по текущей деятельности	070	1266	8902
Прочие расходы по текущей деятельности	080	1762	7445
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (+-060 + 070 - 080)	090	3563	6079
Доходы по инвестиционной деятельности	100	726	2599
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	534	252
доходы от участия в основном капитале других организаций	102	192	2347
проценты к получению	103	-	-
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	512	147
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	512	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	147
Доходы по финансовой деятельности	120	10	1011
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	10	877
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	134
Расходы по финансовой деятельности	130	2006	5443
В том числе:			
проценты к уплате	131	1991	3766
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	15	1541
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	136
Иные доходы и расходы	140	166	381
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 - 110 + 120 - 130 +- 140)	150	(1616)	(1599)
Прибыль (убыток) до налогообложения (+-090 +- 150)	160	1947	4480
Налог на прибыль	170	461	1177
Изменения отложенных налоговых активов	180	-	-
Изменения отложенных налоговых обязательств	190	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	221
Чистая прибыль (убыток) (+-160 - 170 +- 180 +- 190 - 200)	210	1486	3082
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (+-210 +-220+-230)	240	1486	3082
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Доля государства в уставном фонде эмитента 0 %.

Информация о дивидендах и акциях

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	344	-
в том числе: юридических лиц	лиц	1	-
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	1	-
в том числе: физических лиц	лиц	343	-
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	1	-
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	-	445,00
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	миллионов рублей	229,00	426,00
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	-	
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги)	рублей	25,758	
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	7,795	
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	0	0

Простые акции, поступившие в распоряжение общества			Простые акции, приобретенные в целях сокращения общего количества	
Дата поступления акций на счет «депо» общества	Количество акций, шт.	Срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества	Дата поступления акций на счет «депо» общества	Количество акций, шт.
-	-	-	-	-

Отдельные финансовые результаты

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	миллионов рублей	30512,00	62931
Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	миллионов рублей	26453,00	58309
Прибыль (убыток) до налогообложения, всего	миллионов рублей	1947,0	4480,0
в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	миллионов рублей	4059,0	4622,0
в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности	миллионов рублей	-496,00	1457,00
в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятель

ВЯСКОВЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ

Зінаіда Лабаноўская ў свае 24 гады — галоўны эканаміст СВК «Мір» Дрыбінскага раёна. У гэтую гаспадарку выпускніца Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі трапіла па размеркаванні.

Яна сама родам з Дрыбіна, а з мужам Уладзімірам пазнаёмілася праз сваякоў, калі была яшчэ студэнткай. Так што на першае працоўнае месца яна прыехала не адна. Маладой сям'і гаспадарка выдзеліла камфортнае жыллё, а Уладзімір Лабаноўскі цяпер ездзіць на працу ў раённы цэнтр, дзе ўладкаваўся настаўнікам у школе.

Калегі ставяцца да галоўнага эканаміста з павагай, называюць Зінаідай Міхайлаўнай. Яна сама прызнаецца, што спачатку было даволі цяжка: вопытны галоўны эканаміст гаспадаркі пайшоў на пенсію, і Зінаідзе адразу даверылі адказную працу.

— Давялося спасцігаць усё самой, — узгадвае жанчына. — Але здолела, і цяпер ужо не страшна. Спраўляюся.

У сельскага эканаміста зусім не архаічны вобраз: светлыя доўгія валасы, моднае бэжавае паліто і замшавыя боцікі.

— У мяне ёсць і гумавыя боты, — смяецца Зінаіда. — У праўленні можна і ў кароткай спадніцы сядзець, а ўвесну на ферме і вакол яе самы зручны абутак — той, які выраблены з гумы.

Аднак у развагах пра выгляд яна не забывае пра важнасць сваёй працы і ў любы момант гатова разважаць пра эфектыўнасць працы СВК «Мір».

— Малако — гэта асноўны даход нашай гаспадаркі, — тлумачыць Лабаноўская. — Летась мы атрымалі ад рэалізацыі малака больш за 5 мільярдаў рублёў, прыбытак перавысіў 2 мільярды.

СВК «Мір» — невялікая гаспадарка, яе калісьці склалі перасяленцы з забруджанага чарнобыльскай радыяцыяй Краснапольскага раёна. Зараз яна стала адной з лепшых у Дрыбінскім раёне.

Адна з дзвюх асноўных фермаў — «Ярыгі», якая будзе пашырацца.

— У нас амаль усе даяркі перавысілі рубеж у 5 тысяч літраў на карову, — хваліцца загадчыца фермы Галіна Старавыбарная. — Гэта няпроста зрабіць.

Будаўніцтва новай фермы пачалося летась з ініцыятывы кіраўніцтва Магілёўскай вобласці, якое паставіла задачу павелічэння вытворчасці малака, у тым ліку за кошт пабудовы сучасных фермаў. У Ярыгах працавалі і студэнцкія будаўнічыя атрады. У выніку тут атрымаецца цэлы комплекс, дзе будзе больш за 600 галоў дойнага статка. Першая чарга хутка падыдзе да завяршэння — у маі плануецца яе ўвод.

— Мы выкарыстоўваем уласныя сродкі, бяром крэдыты, — тлумачыць кіраўнік гаспадаркі Мікалай Рыжкоў. — Выдаткавана ўжо 8 мільярдаў рублёў, але каб завяршыць будаўніцтва, адкрываем яшчэ адну крэдытную лінію на 2,8 мільярда рублёў. Калі не ўпадзе попыт на малако (а ён, напэўна, падаць не будзе), усе грошы вернем, праект акупіцца. Малако дае прыбытак.

На пачатку года даяркі СВК «Мір» атрымлівалі сярэдні заробак больш за 3 мільёны рублёў, але гэта не мяжа. Ён будзе расці, калі адбудуецца новая ферма.

— У нас павялічыцца пагалоўе жывёлы і надоі малака, — дае эканамічны каментар Зінаіда Лабаноўская. — Малако — гэта заўсёды запатрабаваны прадукт. Мяркую, што выручка ад яго нават сёлета павялічыцца на некалькі мільярдаў рублёў. Галоўнае, каб хапіла кармоў для жывёлы. Але спецыялісты і работнікі гаспадаркі з гэтым справяцца.

Міхаіл Рыжкоў сёння ходзіць па будынку новай фермы і распавядае, дзе размесціцца стойлы для кароў, а дзе будуць кармавыя сталы. Цяпер работы вядуцца на даху.

— Мы павінны ўкласціся ў тэрміны, — плануе старшыня. — Вельмі разлічваем на аддачу ўкладзеных сродкаў. Таму спачатку новую ферму даверым вопытным даяркам, а потым ім на змену пойдзе і моладзь.

Замацаванне маладых кадраў — гэта тэма, якая хвалюе кіраўніцтва краіны і людзей на месцах. У СВК «Мір» уладкаваліся чатыры маладыя спецыялісты. Тая ж Зінаіда Лабаноўская лічыць, што праца ў сельскай гаспадарцы нічым не горшая за іншую.

— У нас у доме ёсць усе выгоды: газ, цэнтральнае ацяпленне, вада, — расказвае Зінаіда. — Так што я зусім не лічу, што зрабіла нейкі мужны ўчынак, калі паехала на вёску. Мы жывём, як у горадзе. У нас ёсць нават трэнажорная зала — у школе, можна і ў тэніс там гуляць.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

Дрыбінскі раён.

■ На свае вочы

ЛЕБЯДЗІНАЯ... АТАКА

Што можна ўбачыць падчас арніталагічнай экскурсіі?

